# НАВУКОВА-ПЕДАГАГІЧНАЯ ШКОЛА «РЭГІЯНАЛЬНЫ, АГУЛЬНАНАЦЫЯНАЛЬНЫ І АГУЛЬНАЧАЛАВЕЧЫ ЎЗРОЎНІ Ў ЛІТАРАТУРЫ І ФАЛЬКЛОРЫ: ДУХОЎНАЯ СПАДЧЫНА БЕЛАРУСАЎ У СУСВЕТНЫМ КАНТЭКСЦЕ»

***Апісанне***

Навуковая школа арыентавана на наступныя напрамкі даследаванняў:

- Духоўная спадчына Беларускага Палесся.
- Жанр як знакавая сістэма эстэтычнай традыцыі ў нацыянальнай і еўрапейскай культурна-мастацкай практыцы.
- Пытанні тэорыі літаратуры.
- Вывучэнне беларускай літаратуры ў сусветным кантэксце.

***Перавагі***



Комплексны падыход даследаванняў навукова-педагагічнай школы ахоплівае асноўныя напрамкі развіцця беларускай літаратуры, дазваляе выявіць яе нацыянальную адметнасць у агульнаславянскім і еўрапейскім культурным дыялогу, акрэсліць шляхі далейшага развіцця нацыянальнага вербальнага мастацтва ў новым тысячагоддзі. Прыцягненне шырокага факталагічнага матэрыялу мае на мэце ўвядзенне ў літаратурны і навуковы кантэкст новых імёнаў, часам малавядомых не толькі чытацкай аудыторыі, але і спецыялістам, папулярызацыю творчых дасягненняў пісьменнікаў Гомельшчыны і выпускнікоў ГДУ імя Ф. Скарыны. Пры кафедры функцыянуе музей “Alma mater” і вучэбна-навуковая лабараторыя “Літаратурнае краязнаўства”.

***Навізна***

Навуковая навізна комплекснага даследавання ў абазначаных кірунках заключаецца ў вызначэнні ролі рэгіянальнага духоўнага фактару ў станаўленні і развіцці нацыянальнага спосабу мастацкага асэнсавання рэчаіснасці; паказе шматузроўневасці жанравай сістэмы беларускай літаратуры ў агульнаславянскім і еўрапейскім кантэкстах і наватарскіх тэндэнцый у сучасным літаратурным працэсе; выяўленні асаблівасцей гістарыясофскай і этыка-антрапалагічнай праблематыкі беларускай літаратуры XX – пачатку XXI стагоддзяў.

***Варыянты супрацоўніцтва***

Выкладчыкі кафедры беларускай літаратуры УА “ГДУ імя Ф. Скрыны”, якія маюць шматгадовы вопыт, выконваюць наступныя віды работ: правядзенне экскурсій (віртуальных і рэальных) па творчасці пісьменнікаў Гомельшчыны, славутых выпускнікоў ГДУ імя Ф. Скарыны, напісанне манаграфіі па гісторыі развіцця літаратуры Гомельшчыны, індывідуальных артыкулаў для канкрэтнага аўтара, стварэнне паэтычных анталогій, у якіх раскрываецца прыгажосць прыроды і людзей рэгіёна.

IVAN SHTEINER, HEAD OF THE LABORATORY "LITERARY LOCAL HISTORY", DOCTOR OF PHILOLOGICAL SCIENCES, PROFESSOR, CORRESPONDING MEMBER OF THE INTERNATIONAL EURASIAN ACADEMY OF SCIENCES
tel. +(375 232) 60-32-40, fax +(375 232) 60-30-02,
e-mail: belitchair@gsu.by, http:// philology.gsu.by/